# Лукашэнка і Пуцін абмеркавалі міжнародныя праблемы, абстаноўку ў краінах, COVID-19 і падвялі вынікі сумесных мерапрыемстваў

Фота з архіва
Тэлефонная размова Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі з Прэзідэнтам Расіі Уладзімірам Пуціным адбылася сёння. У час размовы кіраўнікі дзяржаў абмеркавалі самы шырокі спектр тэм, паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе беларускага лідара.

У полі зроку прэзідэнтаў быў шэраг міжнародных праблем. У тым ліку сітуацыя ў Нагорным Карабаху.

Ва ўзаемасувязі з існуючымі еўрапейскімі праблемамі Аляксандр Лукашэнка і Уладзімір Пуцін абмеркавалі сітуацыю ў Беларусі і Расіі. І абмяняліся падрабязнай інфармацыяй пра абстаноўку ўнутры краіны.

Значная ўвага ў час размовы была ўдзелена сітуацыі з распаўсюджваннем COVID-19, выказана заклапочанасць ростам захваральнасці на гэту інфекцыю.

Прэзідэнты абмеркавалі далейшыя дзеянні па нармалізацыі транспартных зносін – авіяцыйных, чыгуначных і аўтамабільных – паміж дзвюма краінамі.

Таксама вялікую ўвагу Аляксандр Лукашэнка і Уладзімір Пуцін удзялілі аналізу праведзеных сумесных ваенных вучэнняў “Славянскае братэрства – 2020”.

Акрамя таго, кіраўнікі дзяржаў падрабязна абмеркавалі вынікі

VII Форуму рэгіёнаў Беларусі і Расіі, падкрэслілі важнейшую ролю ў двухбаковых адносінах прамых кантактаў на ўзроўні кіраўнікоў рэгіёнаў і прадпрыемстваў. Было выказана перакананне, што пазітыўныя вынікі гэтай сумеснай работы павінны ў першую чаргу адчуць на сабе грамадзяне дзвюх краін.

БЕЛТА